УДК 811.161.3+811.113.6

**А. С. Алёшын[1], Я. Я. Іваноў[2]**
[1]Санкт-Пецярбургскі дзяржаўны ўніверсітэт тэлекамунікацый імя М. А. Бонч-Бруевіча, Расійская Федэрацыя
[2]Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. А. Куляшова

## МАТЭРЫЯЛЫ ДА ЎКЛАДАННЯ БЕЛАРУСКА-ШВЕДСКАГА СЛОЎНІКА ПРЫКАЗАК

Адной з праблем сучаснай славістыкі з'яўляецца супастаўляльнае апісанне фразеалогіі і парэміялогіі славянскіх і неславянскіх моў і стварэнне славянска-неславянскіх фразеалагічных і парэміялагічных слоўнікаў. Актуальнай у сувязі з гэтым з'яўляецца распрацоўка прынцыпаў і структуры беларуска-шведскага слоўніка прыказак. У артыкуле разглядаюцца прынцыпы дыферэнцыяцыі нацыянальна спецыфічных і агульных з іншымі мовамі (інтэрнацыянальных, універсальных) адзінак парэміялагічнага фонду мовы. Выяўленне і размежаванне міжмоўнай спецыфічнасці / агульнасці прыказак прапануецца ажыццяўляць у сінхранічным аспекце пры дапамозе супастаўлення структурна-семантычных мадэлей прыказак розных моў у праекцыі на мовы роднасных груп, арэальных кантактаў, тыпалагічных супольнасцей. Вызначаюцца і дыферэнцыююцца тыпы міжмоўных падабенстваў / адрозненняў парэміялагічных адзінак, якія маюць аналагі ў іншых мовах, на падставе поўнага / частковага супадзення лексіка-граматычнай структуры прыказкі. Вылучаюцца тыя міжмоўныя тыпы падабенстваў / адрозненняў парэміялагічных адзінак, якія з'яўляюцца найбольш значнымі для лексікаграфічнага апісання. Вызначаюцца прынцыпы і структура слоўнікавай рэпрэзентацыі беларускіх і шведскіх прыказак у двухмоўным супастаўляльным парэміялагічным слоўніку. Прыводзяцца прыклады асобных зон слоўнікавага артыкула ў беларуска-шведскім слоўніку прыказак.

Даследаванне выканана па заданні Дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў 2021–2025 гг. (дзяржаўная рэгістрацыя № 20211335).

**Ключавыя словы:** парэміялогія, прыказкі, міжмоўнае супастаўленне, беларуская мова, шведская мова, двухмоўны супастаўляльны слоўнік, зоны лексікаграфічнага апісання прыказак.

**Для цытавання:** Алёшын А. С., Іваноў Я. Я. Матэрыялы да ўкладання беларуска-шведскага слоўніка прыказак // Труды БГТУ. Сер. 4, Принт- и медиатехнологии. 2022. № 1 (255). С. 86–95.

**A. S. Aleshin[1], E. E. Ivanov[2]**
[1]The Bonch-Bruevich Saint-Petersburg State University of Telecommunications, Russian Federation
[2]Mogilev State A. Kuleshov University

## MATERIALS FOR THE COMPILATION OF THE BELARUSIAN-SWEDISH DICTIONARY OF PROVERBS

One of the problems of modern Slavic studies is the comparative description of phraseology and paremiology of Slavic and non-Slavic languages and the creation of Slavic – non-Slavic phraseological and paremiological dictionaries. In this regard, the development of the principles and structure of the Belarusian-Swedish dictionary of proverbs is relevant. The article presents the principles of differentiation of nationally specific and common with other languages (international, universal) units of the paremiological fund of the language. It is proposed to identify and differentiate the interlanguage specificity / commonality of proverbs in a synchronic aspect by comparing the structural and semantic proverbs models of different languages projected on the languages of related groups, areal contacts and typological communities. The types of interlingual similarities / differences of paremiological units that

have analogues in other languages are determined and differentiated on the basis of complete / partial coincidence of the proverb lexical and grammatical structure. Those interlanguage types of similarities / differences of paremiological units are highlighted, which are the most significant for the lexicographic description. The principles and structure of the dictionary representation of Belarusian and Swedish proverbs in a bilingual comparative paremiological dictionary are determined. Examples of separate zones of a dictionary entry in the Belarusian-Swedish dictionary of proverbs are given.

The study was carried out of the task of the State Program of Scientific Research in 2021–2025 (project No 20211335).

**Key words:** paremiology, proverbs, interlingual comparison, Belarusian, Swedish, bilingual comparative dictionary, zones of proverbs lexicographic description.

**For citation:** Aleshin A. S., Ivanov E. E. Materials for the compilation of the Belarussian-Swedish dictionary of proverbs. *Proceedings of BSTU, issue 4, Print- and Mediatechnologies*, 2021, no. 1 (255), pp. 86–95 (In Belarusian).

**Уводзіны.** Адной з актуальных праблем сучаснай славістыкі з'яўляецца супастаўленне фразеалогіі і парэміялогіі славянскіх і неславянскіх моў і стварэнне перакладных двухмоўных славянска-неславянскіх слоўнікаў фразеалагізмаў і прыказак. Супастаўляльнае апісанне прыказак як моўных адзінак актыўна развіваецца ў межах парэміялогіі як асобнай лінгвістычнай дысцыпліны [1–3].

Адносна паспяхова названая праблема вырашаецца ў беларускім мовазнаўстве [4]. У апошнія гады ў гэтым кірунку створана больш слоўнікаў, чым за ўвесь папярэдні час [5]. Укладзены шэраг перакладных беларуска-іншамоўных слоўнікаў прыказак [6–10], створаны руска-беларускі слоўнік устойлівых параўнанняў [11]. Беларускія выразы шырока прадстаўлены ў полілінгвальных слоўніках біблеізмаў [12, 13]. Зусім нядаўна пабачыў свет фундаментальны мультылінгвальны слоўнік-даведнік *«Універсальны і інтэрнацыянальны кампаненты ў парэміялагічным складзе беларускай мовы: беларуска-іншамоўны слоўнік»* (2020), складзены Ю. А. Петрушэўскай [14].

Трэба адзначыць, што беларуска-шведскія прыказкавыя паралелі ніколі не былі прадметам спецыяльнага даследавання. Увогуле найбольш распрацаваным у адносінах да фразеалогіі і парэміялогіі ўсходнеславянскіх моў з'яўляецца супастаўляльнае апісанне ўстойлівых адзінак розных тыпаў шведскай і рускай моў [15–21].

Важнай у гэтай сувязі выступае праблема распрацоўкі прынцыпаў укладання беларуска-шведскага слоўніка прыказак.

Асноўным тут бачыцца вырашэнне двух пытанняў, што паўстаюць перад укладальнікам любога перакладнога слоўніка ўстойлівых адзінак: 1) якія менавіта прыказкавыя адзінкі беларускай мовы ўключаць у рэестравую частку; 2) як дыферэнцыраваць іншамоўныя адпаведнікі беларускіх прыказак. Ад таго, наколькі дакладна будуць вырашаны гэтыя пытанні, залежыць ступень рэпрэзентатыўнасці перакладнога парэміялагічнага слоўніка.

**Асноўная частка.** У левай частцы слоўніка мэтазгодна, на наш погляд, змяшчаць толькі найбольш актыўныя беларускія прыказкі, якія складаюць прыказкавы мінімум і асноўны прыказкавы фонд беларускай мовы [22–24]. Пры гэтым перавага павінна аддавацца не інтэрнацыянальным, а ўласна беларускім прыказкам, якія з'яўляюцца ўнікальнымі, не сустракаюцца ў іншых мовах [25–27].

Для аб'ектыўнага вызначэння і апісання ў прыказкавым фондзе ўласна нацыянальнага кампанента (спецыфічных у адносінах да іншых моў адзінак) выкарыстоўваецца «метад сінхранічнай дыферэнцыяцыі», які грунтуецца на сінхранічнай міжмоўнай праекцыі прыказак на шырокі іншамоўны матэрыял, актуальны для сучаснага носьбіта мовы. Пры дапамозе метаду сінхранічнай дыферэнцыяцыі можна выявіць нацыянальна спецыфічныя адзінкі (іх аб'ём і састаў) на фоне прыказак, якія сустракаюцца ў іншых мовах, але прадстаўлены ў кожнай мове ў форме нацыянальна спецыфічных варыянтаў [28–30].

Правільнае вызначэнне спецыфічных і агульных з іншымі мовамі прыказак дазваляе атрымаць найбольш аб'ектыўны фактычны матэрыял для пошуку міжмоўных падабенстваў і адрозненняў у прыказкавых фондах моў [31].

Іншамоўныя адпаведнікі і эквіваленты беларускіх прыказак варта дыферэнцыраваць у правай частцы слоўніка зыходзячы з тыпалогіі міжмоўных аналагаў (паводле структурна-семантычнай блізкасці / аддаленасці прыказак у дадзеных дзвюх мовах), распрацаванай і дастаткова шырока апрабаванай у беларускай перакладной парэміяграфіі [32–41].

Можна вылучыць усяго 9 тыпаў міжмоўных падабенстваў і адрозненняў, якія заснаваны на поўным ці частковым супадзенні ці, наадварот, несупадзенні семантыкі і структуры (resp. лексіка-граматычнай арганізацыі) прыказак. Так, пры параўнанні прыказак беларускай і рускай, польскай, англійскай моў выяўлены ўсе тыпы міжмоўных

падабенстваў і адрозненняў (для кожнай пары моў).

Першы тып – прыказкавыя адзінкі, якія супадаюць як паводле зместу, так і па лексічна-граматычнай арганізацыі, напр.: *Язык без касцей* і руск. *Язык без костей*; *Што галава, то розум* і польск. *Co głowa, to rozum*; *Не ўсё тое золата, што блішчыць* і англ. *All is not gold that glitters* і да т. п.

Другі тып – прыказкавыя адзінкі, якія супадаюць паводле зместу і часткова па лексічна-граматычнай арганізацыі, напр.: ***Спроба*** *не хвароба* і руск. ***Попытка*** *не пытка*; *Салаўя* ***байкамі не кормяць*** і польск. *Głodnego* ***bajkami nie nakarmisz***; ***Не вучы*** *вучонага* і англ. ***Don't teach*** *fishes to swim* і да т. п.

Трэці тып – прыказкавыя адзінкі, якія супадаюць паводле зместу, але не супадаюць па лексічна-граматычнай арганізацыі, напр.: *Пакуль жаніцца – загаіцца* і руск. *До свадьбы заживёт*; *Дзеду міла, а ўнуку гніла* і польск. *Każdy ma swój gust*; *Груган ругану вачэй не выдзеўбе* і англ. *Dog doesn't eat dog* і да т. п.

Чацвёрты тып – прыказкавыя адзінкі, якія супадаюць часткова паводле зместу і не супадаюць па лексічна-граматычнай арганізацыі, напр.: *Хто каго любіць, той таго і чубіць* (у больш шырокім значэнні 'Пра ўзаемаадносіны паміж тымі, хто неабыякавы адзін да аднаго' [42, с. 553]) і руск. *Милые бранятся, только тешатся* ('Ссоры людей, которые на самом деле любят друг друга, быстро заканчиваются примирением. Говорят, когда не придают значения раздорам между близкими людьми; призывают не вмешиваться в конфликт' [43, с. 159]); *У сямі нянек дзіця без вока (без носа)* ('Справы кепскія, калі за іх бярэцца адразу некалькі чалавек. Гаворыцца з асуджэннем пра безадказныя адносіны да справы, калі адзін спадзяецца на другога' [42, с. 533]) і польск. *Gdzie kucharek sześć, tam nie ma co jeść* (у больш шырокім значэнні 'Gdzie kilku specjalistów od jednej rzeczy tam ciągle są problemy. Dlatego w sprawach które mamy wątpliwości winniśmy radzić się jednej osoby i jej ufać' [44]); *Няма ліха без дабра* (у больш шырокім значэнні 'Гаворыцца, калі ўдача, што-н. добрае, карыснае стала вынікам якой-н. бяды, непрыемнасці) [42, с. 403]) і англ. *Every cloud has a silver lining* (літаральна 'Кожная аблачынка мае срэбную падкладку', г. зн. кожная хмарка, якая закрывае сонца, мае па краях срэбную лінію, што паказвае на існаванне па-за ёй сонца, якое рана ці позна павінна з'явіцца; ужываецца ў значэнні 'У любым дрэнным становішчы можна знайсці і добры бок, які дае надзею на лепшае' [45, prov. 171]) і да т. п.

Пяты тып – прыказкавыя адзінкі, якія супадаюць часткова як паводле зместу, так і па лексічна-граматычнай арганізацыі, напр.: *Ліха* ***перамелецца*** *– дабро* ***будзе*** ('Трэба перабыць часовыя непрыемнасці або няшчасце' [46, с. 131]) і руск. ***Перемелется*** *– мука* ***будет*** (у больш шырокім значэнні 'Всё со временем пройдёт, изменится к лучшему, неприятности будут забыты. Говорится, чтобы утешить, успокоить, ободрить того, кто взволнован, расстроен происходящими событиями, испытывает какие-либо трудности' [43, с. 170]); *Да пары* ***збан ваду носіць*** *<ручка* ***(вушка) адарвецца*** *– збан паб'ецца>* ('Усяму бывае канец' [42, с. 157]) і польск. *(Do-)póty* ***dzban wodę nosi***, *(do-)póki mu* ***się ucho nie urwie*** (у больш шырокім значэнні 'Każdy czyn ma swoje konsekwencje w przyszłości; jeżeli działamy nieostrożnie to może zakończyć się do nieszczęściem' [44]); ***Лепей смерць*** *на полі, як жыццё ў няволі* (у прамым значэнні [42, с. 298]) і англ. ***Better*** *a glorious* ***death*** *than a shameful* ***life*** (у больш шырокім прамым значэнні, абумоўленым прыметнікам *shameful* 'ганебны' [6, с. 20]) і да т. п.

Шосты тып – прыказкавыя адзінкі, якія супадаюць часткова паводле зместу і цалкам па лексічна-граматычнай арганізацыі, напр.: *Бадлівай карове бог рог не дае* ('Той, хто хацеў бы зрабіць каму-небудзь штосьці дрэннае, не мае магчымасці ажыццявіць сваё жаданне' [42, с. 81]) і руск. *Бодливой корове бог рог не даёт* (у больш шырокім значэнні 'Тот, кто хочет чего-либо, стремится к чему-либо, кто мог бы злоупотребить своим положением, не получает возможность осуществить желаемое' [47, с. 49]); *Што край – то абычай (звычай)* ('У кожным краі свае звычаі' [42, с. 604]) і польск. *Co kraj, to obyczaj (zwyczaj)* (у больш шырокім значэнні 'Każdy kraj i region posiada swoją unikatową kulturę i tradycję w obrębie świata' [44]); *Ніколі не адкладвай на заўтра, што можна зрабіць сёння* (у прамым значэнні [42, с. 505]) і англ. *Never put off till tomorrow what may be done today* (у больш вузкім значэнні 'Калі што-небудзь павінна быць зроблена, то гэта трэба рабіць адразу' [45, prov. 491]) і да т. п.

Сёмы тып – прыказкавыя адзінкі, якія не супадаюць як паводле зместу, так і па лексічна-граматычнай арганізацыі, напр.: *Воўк сабакі не баіцца, але звягі не любіць* і руск. *В чужой монастырь со своим уставом не ходят*; *Не заўсягды, як на дзяды*; *Пазнаюць нашу дачку і ў андарачку* і польск. *Dzieci i ryby głosu nie mają*; *Na to ma kowal kleszcze, żeby sobie rąk nie sparzyć*; *Няма лесу без ваўка* і англ. *Every dog has his day* і да т. п.

Восьмы тып – прыказкавыя адзінкі, якія не супадаюць паводле зместу, але супадаюць часткова па лексічна-граматычнай арганізацыі, напр.: *Хто каго* ***любіць***, *той таго чубіць* і польск. *Niechaj* ***bije***, *byle* ***lubił***; *Па* ***пер'і птушку*** *пазнаюць* і англ. *Fine* ***feathers*** *make fine* ***birds*** і да т. п.

Дзявяты тып – прыказкавыя адзінкі, якія не супадаюць паводле зместу, але супадаюць па лексічна-граматычнай арганізацыі, напр.: *Не лезь раней бацькі ў пекла* (‘Давярай больш вопытным’ [46, с. 160]) і руск. *Не лезь вперёд (наперёд, поперёд) батьки в пекло* (‘Не берись за опасное, трудное дело, опережая более опытного, старшего по возрасту или положению человека. Говорится как предупреждение о возможных трудностях, неприятностях или как объяснение причин постигшей человека неудачи’ [43, с. 16]); *Без працы не есці коляцы* (у прамым значэнні ‘Гаворыцца як павучанне працаваць’ [42, с. 87]) і польск. *Bez pracy nie ma kołaczy* (‘Praca jest środkiem do sukcesu i nie ma możliwości aby bez wysiłku udało nam się spełnić marzenia’ [44]); *Лепш позна, чым ніколі* (‘Ужываецца як рэакцыя на якія-небудзь дзеянні, што адбыліся са спазненнем’ [42, с. 301]) і англ. *Better late ten never* (‘Лепш выканаць абяцанне з вялікім спазненнем, чым зусім не выканаць. Ужываецца ў іранічным сэнсе’ [45, prov. 48]) і да т. п.

Іншамоўныя адпаведнікі ў правай частцы слоўніка мэтазгодна пазначаць паводле сістэмы параграфем (на падставе агульнапрынятых ў матэматычнай логіцы знакаў размежавання ступеняў раўназначнасці / эквівалентнасці). Такая сістэма параграфем была прапанавана і апрабавана ў шэрагу беларуска-іншамоўных парэміялагічных слоўнікаў [6–10].

Слоўнікавы артыкул у беларуска-шведскім слоўніку прыказак мэтазгодна размежаваць на шэсць зон. Першыя чатыры зоны складаюць левую частку перакладнога слоўніка. Пятая і шостая зоны – яго правую частку.

У першых чатырох зонах апісваецца беларуская прыказка (прыказка як загалоўкавая адзінка; тлумачэнне значэння і сітуацыі ўжывання прыказкі; літаральны пераклад прыказкі на шведскую мову; пераклад значэння і сітуацыі ўжывання прыказкі на шведскую мову).

У пятай зоне даюцца шведскія эквіваленты [48], якія размяшчаюцца паводле павелічэння адрозненняў (памяншэння падабенстваў) ад беларускай прыказкі ў лексіка-граматычным і семантычным планах. У шостай зоне даецца літаральны пераклад беларускай прыказкі на рускую мову або рускі поўны прыказкавы аналаг беларускай прыказкі.

Прывядзем прыклады напаўнення асобных слоўнікавых зон беларуска-шведскага слоўніка прыказак.

**Дараванаму (Дармавому, Даровaнаму) каню ў зубы не глядзяць.** *Падарункі не абмяркоўваць, а атрымліваюць з удзячнасцю. Гаворыцца, калі хто-небудзь пачынае прыдзірліва ацэньваць тое, што атрымаў задарма.* “Given häst tittar man inte i munnen”. *Man diskuterar inte en present, utan mottar den med tacksamhet.* = **Man skall icke se given häst i munnen** («Не трэба глядзець дараванаму каню ў рот»). Руск. «Дарёному коню в зубы не смотрят».

**Дыму без агню не бывае.** *На ўсё ёсць свая прычына; без прычыны нічога не бывае. Гаворыцца, калі распаўсюджваюцца якія-небудзь чуткі.* “Det kan inte vara rök utan eld”. *Inget rykte utan grund. Används vid ryktesspridning.* = **Ingen rök utan eld** («Ніякага дыму без агню»). Руск. Дыма без огня не бывает.

**Адна ластаўка вясны не робіць.** *Адзінкавыя прыметы якой-небудзь з’явы яшчэ не сведчаць пра яе існаванне, узнікненне, надыход і пад., не могуць аказваць істотны ўплыў на што-небудзь. Гаворыцца як папярэджанне аб беспадстаўнасці залішне хуткіх вывадаў.* “En svala gör ingen vår”. *Enstaka tecken eller företeelser låter inte dra viktiga slutsatser. Används för att varna för snabba slutsatser.* ≅ **En svala gör ingen sommar** («Адна ластаўка не робіць лета»). ~ **Trädet faller inte vid första hugget** («Дрэва не падае ад першага ўдару»). Руск. «Одна ласточка весны не делает».

**Прыяцель пазнаецца ў няшчасці.** *Даведацца, хто сапраўдны сябар можна толькі ў складанай сітуацыі. Гаворыцца, калі хто-небудзь дапамог або не дапамог таму, хто трапіў у складаную сітуацыю.* “Kamraten lär man känna i olyckan”. *Man får veta om någon verkligen är ens vän först i en svår situation. Används när någon har hjäpt en (eller inte) i en svår situation.* ≅ **I nöden prövas vännen** (“У галечы правяраецца сябар”). ~ **Striden prövar klingan och nöden vännen** («Бітва правярыць клінок, а галеча сябра»). Руск. «Друг познаётся в беде».

**Добры пачатак – палавіна справы.** *Вельмі важна добра распачаць што-небудзь. Кажуць з задавальненнем, калі паспяхова пачалася якая-небудзь справа.* “Bra början är hälften av saken”. *Det är mycket viktigt att börja något arbete på ett bra sätt.* ≅ **Väl börjat är hälften vunnet** («Добра пачата – напалову выйграна»). Руск. «Доброе начало – половина дела».

**Што пасееш, тое і пажнеш.** *Людзі ставяцца да чалавека так, як гэты чалавек сам ставіцца да людзей. Гаворыцца, калі непрыемныя адносіны, дзеянні з боку людзей да каго-небудзь успрымаюцца як вынік яго ўласных дзеянняў, адносін да іншых.* “Det som man sår, det skördar man”. *Andra ska handla emot en på samma sätt som man handlar mot andra. Används om den vars olyckor uppfattas som resultat av egna handlingar.* = **Som man sår, får man skörda**. ~ **Som man bäddar, får man ligga** («Як пасцелеш, так і будзеш спаць»). Руск. «Что посеешь, то и пожнёшь».

**Аб воўку (На воўка, Пра воўка) памоўка, а ён <і сам> тут.** *Калі некага згадваеш, той адразу з’яўляецца.* “Det är tal om vargen, och han

är själv här”. *När man nämner något, kommer det genast fram.* = **Tala om vargen, så kommer han.** ~ **Tala om trollen, så är de i farstun** («Згадай пра тролей, а яны ўжо ў хаце»). Руск. «Помяни волка, а волк тут».

**Ад ляноты чакай бядоты.** *Лянота вядзе да галечы. Гаворыцца з асуджэннем або як тлумачэнне адсутнасці дабрабыту ў каго-небудзь.* “Av lättjan förvänta dig fattigdom”. *Lättjan leder till fattigdom. Används fördömande eller som en förklaring till någons fattigdom.* ≅ **Lättja har fattigdomen till arvinge** («Спадчыннікам ляноты з’яўляецца беднасць»). ≅ **Lättja lönas med armod** («Лянота аплачваецца галечай»). Руск. «От лени жди нищеты».

**Гаманіць галава не баліць.** *Сказаць можна ўсё, што заўгодна. Гаворыцца як парада звяртаць увагу не на словы, а на справы, учынкі, паводзіны каго-небудзь.* “Av samtal blir det inget huvudvärk”. *Man får säga vad som helst. Används som uppmaning att bry sig inte om ord utan om handlingar, gärningar och beteende.* ≈ **Tala väl är gott, men göra väl är bättre** («Добра казаць гэта добра, але добра рабіць – лепей»). Руск. «От разговоров голова не заболит».

**Зваранай рыбе вада не патрэбна.** *Мёртвы не адчувае патрэбаў ні ў чым. Гаворыцца як папярэджанне не рабіць таго, што нельга будзе выправіць.* “Kokt fisk behöver inget vatten”. *Den som är död har inga behov. Används som förmaning att göra något som inte går att förändra.* ≈ **Man ska inte göra det man ångrar, så slipper man ångra det man har gjort** («Не трэба рабіць таго, аб чым пашкадуеш, і не давядзецца шкадаваць аб тым, што зрабіў»). Руск. «Свареной рыбе не нужна вода».

**З пустога цэбра вады не набярэш.** *З нічога не здабудзеш нічога патрэбнага. Гаворыцца пра немагчымасць мець што-небудзь.* “Man kan inte hälla upp vatten från en tom hink”. *Man kan inte få något nyttigt från ingenting. Används om omöjligheten att få något.* ≈ **Man vet bäst vad vatten är värt, när brunnen är tom** («Лепш за ўсё кошт вады давядаешся тады, калі калодзеж пусты»). Руск. «Из пустого ведра воды не наберёшь».

**Лепей вучоны, як залачоны.** *Лепш быць адукаваным, чым багатым. Гаворыцца як парада здабываць веды.* “Bättre vara lärd än ha guld”. *Det är bättre att vara bildad än att vara rik. Används som upprnaning att få kunskap.* ≈ **Lärd man bär sin rikedom med sig** («Адукаваны чалавек носіць сваё багацце з сабой»). Руск. «Лучше ученый, чем озолоченный».

**Не бойся смерці, бойся старасці.** *Не варта баяцца памерці, трэба баяцца бездапаможнасці ў старасці. Гаворыцца пра старога, хворага чалавека, які дажывае свой век у адзіноце, без прыгляду.* “Var inte rädd för döden, var rädd för ålderdomen”. *Man ska inte vara rädd för döden, man ska vara rädd för att vara hjälplös när man blir gammal. Används om en gammal ensam person som inte får någon vård.* ≈ **Ålderdomens börda är den tyngsta av alla** («Ноша старасці – самая цяжкая з усіх»). Руск. «Не бойся смерти, бойся старости».

**Няма той крамы, дзе прадаюцца родныя мамы (каб прадаваліся мамы).** *Ніхто не замяніць родную маці. Гаворыцца пра таго, хто асірацеў, страціўшы маці.* “Det finns ingen affär där man kan köpa sin egen mamma”. *Ingen kan byta för en ens egen mor. Används om den som förlorade sin mor.* ≈ **Få äro som far, ingen som mor** («Нямногія як бацька, ніхто як маці»). ≈ **Föräldrar vet man uppskatta, när de äro döda** («Бацькоў шануюць калі яны ўжо мёртвыя»). Руск. «Нет такого магазина, где можно купить родную мать».

**Слова не пірог, не выкінеш за парог.** *Сказаныя словы не вернеш і не перайначыш. Гаворыцца як папярэджанне не рабіць неабдуманых выказванняў.* “Ord är ingen kaka, de kan man inte kasta bakom tröskeln”. *Det som man har sagt kan man inte ta tillbaka. Används som förmaning att först tänka och sedan säga.* ~ **Ordet ur munnen och stenen ur handen kan man inte stanna** («Слова з рота і камень з рукі не спыніць»). Руск. «Слово не пирог, не выкинешь за порог».

**У кожнай хаце па печы.** *Кожны павінен думаць пра сябе і асабіста рашаць свае клопаты. Гаворыцца як парада не лезці ў чужыя справы.* “I varje hus finns en spis”. *Var och en måste lösa sina problem själv. Används som råd att inte lägga sig i andras affärer.* ≈ **Råd ingen oombedd**! («Не давай парады нікому, калі не просяць!»). Руск. «В каждой избе по печи».

**Чалавека вочы водзяць.** *Чалавек выбірае той шлях, які бачыць уласнымі вачыма. Гаворыцца як парада не перашкаджаць каму-небудзь самому вырашаць, што яму рабіць, як дзейнічаць.* “Ögon leder människan”. *Var och en väljer den väg som man ser med egna ögon. Används som råd att låta någon själv bestämma över sitt öde.* ≈ **Människan skapar själv sitt öde** («Чалавек сам стварае свой лёс»). Руск. «Человека ведут глаза».

**Заключэнне.** Распрацоўка прынцыпаў і будовы беларуска-шведскага слоўніка прыказак заснавана на сінхранічнай дыферэнцыяцыі міжмоўнай агульнасці / спецыфічнасці, а таксма тыпалогіі міжмоўных падабенстваў / адрозненняў прыказак беларускай і іншых славянскіх і неславянскіх моў.

Метад сінхранічнай дыферэнцыяцыі спецыфічнага і агульнага (на фоне іншых моў) дазваляе максімальна аб’ектыўна апісваць як нацыянальна-моўную, так і нацыянальна-культурную адметнасць прыказак, вызначаць аб’ём і характар не толькі спецыфічных (на фоне іншых моў) адзінак, але і асіміляваных іншамоўных адзінак у складзе прыказкавых фондаў беларускай і шведскай моў.

Найбольшую значнасць пры параўнальна-супастаўляльным апісанні маюць чатыры тыпы міжмоўных адпаведнікаў беларускіх і шведскіх прыказак: 1) супадаюць цалкам як па значэнні, так і па лексіка-граматычнай структуры; 2) супадаюць цалкам па значэнні і толькі часткова па лексіка-граматычнай структуры; 3) цалкам супадаюць па значэнні і не супадаюць па лексіка-граматычнай структуры; 4) часткова супадаюць па значэнні і цалкам не супадаюць па лексіка-граматычнай структуры.

Слоўнікавы артыкул у беларуска-шведскім слоўніку прыказак дыферэнцыруецца на шэсць асобных зон. У чатырох зонах левай часткі слоўніка апісваецца беларуская прыказка (як загалоўкавая адзінка; яе значэння і сітуацыя ўжывання; літаральны пераклад на шведскую мову; пераклад значэння і сітуацыі ўжывання на шведскую мову). Правая частка слоўніка складаецца з дзвюх зон. У першай зоне даюцца шведскія эквіваленты, якія размяшчаюцца паводле павелічэння адрозненняў (памяншэння падабенстваў) ад беларускай прыказкі ў змесце і лексіка-граматычнай арганізацыі. У другой зоне даецца літаральны пераклад беларускай прыказкі на рускую мову (або, калі трэба, поўны прыказкавы аналаг беларускай прыказкі ў рускай мове).

Беларуска-шведскі парэміялагічны слоўнік адрасаваны найперш студэнтам, магістрантам, аспірантам і выкладчыкам універсітэтаў, будзе карысны спецыялістам у галіне агульнай і супастаўляльнай парэміялогіі і парэміяграфіі, можа выкарыстоўвацца перакладчыкамі, а таксама літаратурнымі рэдактарамі.

## Спіс літаратуры

1. Паремиология без границ / под ред. М. А. Бредиса, О. В. Ломакиной. М.: Изд-во РУДН, 2020. 244 с.

2. Паремиология в дискурсе / под ред. О. В. Ломакиной. М.: URSS: Ленанд, 2015. 294 с.

3. Паремиология на перекрёстках языков и культур / М. А. Бредис [и др.]. М.: Изд-во РУДН, 2021. 246 с.

4. Иванов Е. Е. Белорусская паремиология и афористика в общеевропейском контексте (актуальные проблемы изучения) // XV Міжнародны з’езд славістаў, Мінск, 20–27 жніўня 2013 г.: тэзісы дакладаў: у 2 т. Мінск, 2013. Т. 1. С. 322–323.

5. Иванов Е. Е., Петрушевская Ю. А. Белорусская паремиология конца XX – начала XXI века (1991–2014 гг.): библиографический обзор // Паремиология в дискурсе. М.: URSS: Ленанд, 2015. С. 252–292.

6. Англа-беларускі парэміялагічны слоўнік / пад рэд. Я. Я. Іванова. Магілёў: МДУ імя А. А. Куляшова, 2009. 240 с.

7. Иванов Е. Е. Русско-белорусский словарь пословиц: 777 пословиц русского языка, свыше 5000 белорусских паремиологических эквивалентов и соответствий: в 2 ч. Могилёв: Брама, 2001. Ч. 1. 144 с.; ч. 2. 164 с.

8. Иванов Е. Е., Мокиенко В. М. Русско-белорусский паремиологический словарь. Могилёв: МГУ имени А. А. Кулешова, 2007. 242 с.

9. Іванова С. Ф., Іваноў Я. Я. Польска-беларускі парэміялагічны слоўнік. Магілёў: МДУ імя А. А. Куляшова, 2007. 192 с.

10. Іваноў Я. Я., Раманава Н. К. Беларуска-нямецкі парэміялагічны слоўнік. Магілёў: МДУ імя А. А. Куляшова, 2006. 108 с.

11. Володина Т. В., Мокиенко В. М. Русско-белорусский словарь сравнений. Минск: Беларуская навука, 2018. 811 с.

12. Лепта библейской мудрости: библейские крылатые выражения и афоризмы на русском, английском, белорусском, немецком, словацком и украинском языках / Д. Балакова [и др.]. Могилёв: МГУ имени А. А. Кулешова, 2014. 208 с.

13. Лепта библейской мудрости: русско-славянский словарь библейских выражений и афоризмов с соответствиями в германских, романских, армянском и грузинском языках: в 2 т. / под ред. Е. Е. Иванова [и др.]. Могилёв: МГУ имени А. А. Кулешова, 2019. Т. 1. 334 с.; т. 2. 308 с.

14. Петрушэўская Ю. А. Універсальны і інтэрнацыянальны кампаненты ў парэміялагічным складзе беларускай мовы: беларуска-іншамоўны слоўнік. Магілёў: МДУ імя А. А. Куляшова, 2020. 316 с.

15. Алёшин А. С. К вопросу о принципах лингвокультурологического анализа устойчивых сравнений (на материале устойчивых сравнений шведского языка на фоне русского языка) // Вестник Санкт-Петербургского университета. 2010. Сер. 9. № 1. С. 85–89.

16. Алёшин А. С. Межличностные отношения в шведской лингвокультуре сквозь призму устойчивых сравнений (на фоне русского языка) // Научный диалог. 2017. № 4. С. 9–19.

17. Aleshin A. S. Swedish similes describing a person’s movement as part of the linguistic worldview (in comparison with the russian language material). Scandinavian Philology. 2018. Vol. 16, no. 2. P. 193–207.

18. Алёшин А. С. Шведские и русские пословицы с компаративным компонентом *bättre/лучше* (лингвокультурологический аспект) // Когнитивные исследования языка. 2021. № 2 (45). С. 310–319.

19. Aleshin A., Zinovieva E. Comparative study of phraseological units with the components “ock” and “hen” in swedish and russian /. Scandinavian Philology. 2019. Vol. 17, no. 2. P. 284–297.

20. Алёшин А. С., Зиновьева Е. И. Стереотипное представление о коте и кошке сквозь призму компаративных фразеологизмов русского и шведского языков // Вестник Российского университета дружбы народов. 2019. Сер.: Теория языка. Семиотика. Семантика. Т. 10, № 2. С. 288–300.

21. Алёшин А. С., Зиновьева Е. И. Устойчивые выражения компаративной структуры: лингвокогнитивный аспект (на материале русского и шведского языков) // Вестник Российского университета дружбы народов. 2020. Сер.: Теория языка. Семиотика. Семантика. Т. 11, № 1. С. 7–21.

22. Иванов Е. Е. Паремиологический минимум и основной паремиологический фонд // Паремиология в дискурсе. М.: URSS: Ленанд, 2015. С. 48–66.

23. Ivanov E. E. Paremiological Minimum and Basic Paremiological Stock (Belarusian and Russian). Prague: RSS, 2002. 136 p.

24. Ivanov E. E. “Paremiological Minimum” of the Belarusian Language. Acta Germano-Slavica. 2008. Vol. 3. P. 283–302.

25. Петрушевская Ю. А. Интернациональные, заимствованные и исконно языковые единицы в составе паремиологического фонда современного белорусского языка // Вестник НовГУ. 2014. Сер.: Филологические науки. № 77. С. 123–126.

26. Петрушевская Ю. А. Универсальное и национальное в паремиологической системе языка (на материале английского и белорусского языков) // Acta Germano-Slavica. 2015. Вып. 6. С. 213–216.

27. Петрушэўская Ю. А. Нацыянальная адметнасць прыказкавага фонду беларускай мовы // Учёные записки ВГУ имени П. М. Машерова. 2018. Т. 27. С. 150–154.

28. Петрушэўская Ю. А. Аб’ём і склад універсальных адзінак у парэміялагічным фондзе беларускай мовы // Філологічні студії. 2018. Вип. 18. С. 48–62.

29. Петрушэўская Ю. А. Паняцце парэміялагічнага фонду мовы і прынцыпы яго дыферэнцыяцыі (у сувязі з вызначэннем універсальнага і нацыянальнага кампанентаў у парэміялагічнай сістэме мовы) // Філологічний часопис. 2015. Вип. 1 (6). С. 100–106.

30. Petrushevskaya Ju. A. Универсальное и национальное в составе пословиц современного белорусского литературного языка // Wort – Text – Zeit XII. Greifswald: E. M. A.-Universität, 2013. S. 79–80.

31. Зверева Ю. С., Иванов Е. Е., Шестернёва А. Н. Сравнительная типология фразеологии английского и белорусского языков (актуальность, методология, перспективы исследования) // Восточнославянские языки и литературы в европейском контексте – 2015. Могилёв: МГУ имени А. А. Кулешова, 2016. С. 164–168.

32. Биндасова О. Ю., Иванова С. Ф., Филимонова И. Ю. Лексико-грамматическая организация французских и белорусских пословиц (сравнительный анализ) // Acta Germano-Slavica. 2008. Вып. 3. С. 144–159.

33. Вальтер Х., Иванов Е. Е., Мокиенко В. М. Белорусские пословицы в контексте европейской паремиологии (о русско-немецко-белорусском словаре пословиц с иноязычными параллелями) // Актуальныя праблемы філалогіі і методыкі выкладання філалагічных дысцыплін. Магілёў: МДУ імя А. А. Куляшова, 2015. С. 209–214.

34. Иванов Е. Е. Парадоксальные пословицы в русском и белорусском языках // Вестник НовГУ. 2014. Сер.: Филологические науки. № 77. С. 21–24.

35. Иванов Е. Е., Петрушевская Ю. А. Различия в семантике и структуре белорусских и английских пословиц // Актуальные проблемы преподавания иностранных языков в высшей школе Республики Беларусь. Могилёв: МГУ имени А. А. Кулешова, 2011. С. 213–215.

36. Иванов Е. Е., Романова Н. К. Типы межъязыковых сходств и различий паремиологических единиц (на материале белорусского и немецкого языков) // Acta Albaruthenica, Rossica, Polonica VII. Віцебск: ВДУ імя П. М. Машэрава, 2006. С. 161–164.

37. Іваноў Я. Я. Парэміялагічныя сістэмы беларускай і рускай моў: падабенствы і разыходжанні // Філологічні студії. 2011. Вип. 6. Ч. 2. С. 53–63.

38. Іваноў Я. Я. Прынцыпы супастаўляльнага апісання афарыстычнай парэміялогіі беларускай і рускай моў // Studia sławistyczne. 2003. T. 4. S. 49–55.

39. Іваноў Я. Я., Максімава В. А. Англійскія эквіваленты беларускіх прыказак (лексікаграфічны аспект) // Восточнославянские языки и литературы в европейском контексте – 2015. Могилёв: МГУ имени А. А. Кулешова, 2016. С. 191–196.

40. Петрушевская, Ю. А. Белорусские соответствия английских пословиц (лексикографический аспект) // Die Phraseologie in Raum und Zeit = Фразеология во времени и пространстве. Greifswald: E. M. A.-Universität; СПб.: Изд-во СПбГУ, 2012. С. 136–137.

41. Ivanov E., Feldman V. Principles of the Contrastive Description of Aphoristic Paremiology (in Belarussian and Russian Languages). Acta Germano-Slavica. 2007. Vol. 1. P. 85–97.

42. Лепешаў І. Я., Якалцэвіч М. А. Тлумачальны слоўнік прыказак. Гродна: ГрДУ імя Янкі Купалы, 2011. 695 с.

43. Школьный словарь живых русских пословиц / под ред. В. М. Мокиенко. СПб.: Нева, 2002. 352 с.

44. Co kraj to obyczaj [Electronic Resource] // Polska tradycja. 2019. Mode of access: https://www.polskatradycja.pl/folklor/przyslowia/co-kraj-to-obyczaj-co-rodzina-to-zwyczaj.html. Date of access: 20.12.2021.

45. Ridout R., Witting C. English Proverbs Explained. London: Pan Books LTD, 1969. 223 p.

46. Шкраба І., Шкраба Р. Крынічнае слова: беларускія прыказкі і прымаўкі. Мінск: Мастацкая літаратура, 1987. 286 с.

47. Жуков В. П. Словарь русских пословиц и поговорок. М.: Русский язык, 1991. 534 с.

48. Holm P. Ordspråk och talesätt. Stockholm: Albert Bonniers förlag, 1965. 385 s.

**References**

1. *Paremiologiya bez granits* [Paremiology without Borders] / ed. by M. A. Bredis, O. V. Lomakina. Moscow, RUDN Publ., 2020. 244 p. (In Russian).

2. *Paremiologiya v diskurse* [Paremiology in Discourse] / ed. by O. V. Lomakina. Moscow, URSS Publ. & Lenand Publ., 2015. 294 p. (In Russian).

3. Bredis M. A., Ivanov E. E., Lomakina O. V., Nelyubova N. Yu., Petrushevskaya Ju. A. *Paremiologiya na perekrestkakh yazykov i kul'tur* [Paremiology at the Crossroads of Languages and Cultures]. Moscow, RUDN Publ., 2020. 246 p. (In Russian).

4. Ivanov E. E. Belarusian Paremiology and Aphoristics in the European Context (Actual Problems of Study). *XV Mizhnarodny z''yezd slavistau: tezisy dakladau* [XV International Congress of Slavists: abstracts]. Minsk, 2013, vol. 1, pp. 322–323 (In Russian).

5. Ivanov E. E., Petrushevskaya Ju. A. Belarusian Paremiology of the Late 20th – Early 21st Centuries (1991–2014): a Bibliographic Review. *Paremiologiya v diskurse* [Paremiology in Discourse]. Moscow, URSS Publ. & Lenand Publ., 2015, pp. 252–292 (In Russian).

6. *Angla-belaruski paremiyalagichny slounik* [English-Belarusian Paremiological Dictionary] / ed. by Ya. Ya. Ivanou. Magileu, MDU imya A. A. Kulyashova Publ., 2009. 240 p. (In Belarusian).

7. Ivanov E. E. *Russko-belorusskiy slovar' poslovits* [Russian-Belarusian Dictionary of Proverbs]. Mogilev, Brama Publ., 2001, vol. 1, 144 p.; vol. 2, 164 p. (In Russian).

8. Ivanov E. E., Mokienko V. M. *Russko-belorusskiy paremiologicheskiy slovar'* [Russian-Belarusian Paremiological Dictionary]. Mogilev, MGU imeni A. A. Kuleshova Publ., 2007. 242 p. (In Russian).

9. Ivanova S. F., Ivanou Ya. Ya. *Pol'ska-belaruski paremiyalagichny slounik* [Polish-Belarusian Paremiological Dictionary]. Magileu, MDU imya A. A. Kulyashova Publ., 2007, 192 p. (In Belarusian).

10. Ivanou Ya. Ya., Ramanava N. K. *Belaruska-nyametski paremiyalagichny slounik* [Belarusian-German Paremiological Dictionary]. Magileu, MDU imya A. A. Kulyashova Publ., 2006. 108 p. (In Belarusian).

11. Volodina T. V., Mokienko V. M. *Russko-belorusskiy slovar' sravneniy* [Russian-Belarusian Dictionary of Stable Similes]. Minsk, Belaruskaya navuka Publ., 2018. 811 p. (In Russian).

12. Balakova D., Val'ter Kh., Venzhinovich N. F., Gutovskaya M. S., Ivanov E. E., Mokienko V. M. *Lepta bibleyskoy mudrosti: bibleyskiye krylatyye vyrazheniya i aforizmy na russkom, angliyskom, belorusskom, nemetskom, slovatskom i ukrainskom yazykakh* [The Biblical Wisdom Mite: Biblical Winged Expressions and Aphorisms in Russian, English, Belarusian, German, Slovak and Ukrainian]. Mogilev, MGU imeni A. A. Kuleshova Publ., 2014. 208 p. (In Russian).

13. *Lepta bibleyskoy mudrosti: russko-slavyanskiy slovar' bibleyskikh krylatykh vyrazheniy i aforizmov s sootvetstviyami v germanskikh, romanskikh, armyanskom i gruzinskom yazykakh* [Biblical Wisdom Mite: Russian-Slavic Dictionary of Biblical Winged Expressions and Aphorisms with Equivalents in German, Romance, Armenian and Georgian Languages] / ed. by E. E. Ivanov, V. M. Mokienko, D. Balakova, H. Val'ter. Mogilev, MGU imeni A. A. Kuleshova Publ., 2019, vol. 1. 288 p.; vol. 2. 308 p. (In Russian).

14. Petrusheuskaya Yu. A. *Universal'ny i internatsyyanal'ny kampanenty u paremiyalagichnym skladze belaruskay movy: belaruska-inshamouny slounik* [Universal and International Components in the Paremiological Fund of the Belarussian Language: Belarussian-Foreign Dictionary]. Magileu, MDU imya A. A. Kulyashova Publ., 2020. 316 p. (In Belarusian).

15. Aleshin A. S. On the Question of the Principles of Linguistic and Cultural Analysis of Stable Similes (on the Material of Sustainable Comparisons of the Swedish Language in Background of

the Russian Language). *Vestnik Sankt-Peterburgskogo universiteta* [Vestnik SPbSU], 2010, series 9, no. 1, pp. 85–89 (In Russian).

16. Aleshin A. S. Interpersonal Relations in Swedish Linguistic Culture through the Prism of Stable Similes (in Background of the Russian Language). *Nauchnyy dialog* [Scientific Dialogue], 2017, no. 4, pp. 9–19 (In Russian).

17. Aleshin A. S. Swedish Similes Describing a Person's Movement as Part of the Linguistic Worldview (in Comparison with the Russian Language Material). *Scandinavian Philology*, 2018, vol. 16, no. 2, pp. 193–207.

18. Aleshin A. S. Proverbs with a Comparative Component *bättre/лучше* in Swedish and Russian (a Linguacultural Aspect). *Kognitivnyye issledovaniya yazyka* [Cognitive Studies of Language], 2021, no. 2 (45), pp. 310–319 (In Russian).

19. Aleshin A., Zinovieva E. Comparative Study of Phraseological Units with the Components "ock" and "hen" in Swedish and Russian. *Scandinavian Philology*, 2019, vol. 17, no. 2, pp. 284–297.

20. Aleshin A. S., Zinovieva E. I. Stereotypic Idea of a Tom-Cat and a Cat through the Prism of Comparative Phraseological Units of Russian and Swedish Languages. *Vestnik Rossiyskogo universiteta druzhby narodov* [Peoples' Friendship University of Russia Journal], 2019, series of Language Studies, Semiotics and Semantics, vol. 10, no. 2, pp. 288–300 (In Russian).

21. Aleshin A. S., Zinovieva E. I. A Cognitive Linguistic Study of Comparative Set Phrases in Russian and Swedish. *Vestnik Rossiyskogo universiteta druzhby narodov* [Peoples' Friendship University of Russia Journal], 2020, series of Language Studies, Semiotics and Semantics, vol. 11, no. 1, pp. 7–21 (In Russian).

22. Ivanov E. E. Paremiological Minimum and Basic Paremiological Stock. *Paremiologiya v diskurse* [Paremiology in Discourse]. Moscow, URSS Publ. & Lenand Publ., 2015, pp. 48–66 (In Russian).

23. Ivanov E. E. *Paremiological Minimum and Basic Paremiological Stock (Belarusian and Russian*). Prague, RSS Publ., 2002. 136 p. (In Czech).

24. Ivanov E. E. "Paremiological Minimum" of the Belarusian Language. *Acta Germano-Slavica*, 2008, vol. 3, pp. 283–302 (In Czech).

25. Petrushevskaya Ju. A. International, Borrowed and Native Language Units in the Paremiological Stock of the Modern Belarusian Language. *Vestnik NovGU* [Vestnik NovSU], 2014, serias of Philological Sciences, no. 77, pp. 123–126 (In Russian).

26. Petrushevskaya Ju. A. Universal and National in the Paremiological System of the Language (on the Material of the English and Belarusian Languages). *Acta Germano-Slavica*, 2015, vol. 6, pp. 213–216 (In Russian).

27. Petrushevskaya Ju. A. National Feature of the Proverbial Fund of the Belarusian Language. *Uchenyye zapiski VGU imeni P. M. Masherova* [Scientific Notes of Vitebsk State P. M. Masherov University], 2018, vol. 27, pp. 150–154 (In Belarusian).

28. Petrushevskaya Ju. A. The Volume and Composition of Universal Units in the Belarusian Proverbial Fund. *Filologichni studiï* [Philological Studies], 2018, vol. 18, pp. 48–62 (In Belarusian).

29. Petrushevskaya Ju. A. Concept Paremiological Stock of Language and the Principles of its Differentiation (in Connection with the Definition of Universal and National Components Paremiological Language System). *Filologichniy chasopis* [Philological Review], 2015, vol. 1 (6), pp. 100–106 (In Belarusian).

30. Petrushevskaya Ju. A. Universal and National in the Proverbs of the Modern Belarusian Literary Language. *Wort – Text – Zeit XII*. Greifswald, E. M. A.-Universität, 2013, s. 79–80 (In Russian).

31. Zvereva Ju. S., Ivanov E. E., Shesternyova A. N. Comparative Typology of English and Belarusian Phraseology (Relevance, Methodology, Research Perspectives). *Vostochnoslavyanskiye yazyki i literatury v evropeyskom kontekste – 2015* [East Slavic Languages and Literature in the European Context – 2015]. Mogilev, MGU imeni A. A. Kuleshova Publ., 2016, pp. 164–168 (In Russian).

32. Bindasova O. Yu., Ivanova S. F., Filimonova I. Yu. Lexical and Grammatical Organization of French and Belarusian Proverbs (Comparative Analysis). *Acta Germano-Slavica*, 2008, vol. 3, pp. 144–159 (In Russian).

33. Val'ter Kh., Ivanov E. E., Mokienko V. M. Belarusian Proverbs in the Context of European Paremiology (about the Russian-German-Belarusian Dictionary of Proverbs with Foreign Language Parallels). *Aktual'nyya prablemy filalogii i metodyki vykladannya filalagichnykh dystsyplin* [Current Problems of Philology and Methods of Teaching Philological Disciplines]. Magileu, MDU imya A. A. Kulyashova Publ., 2015, pp. 209–214 (In Russian).

34. Ivanov E. E. Paradoxical Proverbs in Russian and Belarusian. *Vestnik NovGU* [Vestnik NovSU], 2014, serias of Philological Sciences, no. 77, pp. 21–24 (In Russian).

35. Ivanov E. E., Petrushevskaya Ju. A. Differences in Semantics and Structure of Belarusian and English Proverbs. *Aktual'nyye problemy prepodavaniya inostrannykh yazykov v vysshey shkole Respubliki*

*Belarus'* [Actual Problems of Teaching Foreign Languages in Higher Education of the Republic of Belarus]. Mogilev, MGU imeni A. A. Kuleshova Publ., 2011, pp. 213–215 (In Russian).

36. Ivanov E. E., Romanova N. K. Types of Interlingual Similarities and Differences of Paremiological Units (Based on the Material of the Belarusian and German Languages). *Acta Albaruthenica, Rossica, Polonica VII*. Vitebsk, VGU imeni P. M. Masherova Publ., 2006, pp. 161–164 (In Russian).

37. Ivanou Ya. Ya. Paremiological Systems of the Belarusian and Russian Languages: Similarities and Differences. *Filologichni studiї* [Philological Studies], 2011, vol. 6, part 2, pp. 53–63 (In Belarusian).

38. Ivanou Ya. Ya. Principles of Comparative Description of Aphoristic Paremiology of Belarusian and Russian Languages. *Studia sławistyczne*, 2003, vol. 4, pp. 49–55 (In Belarusian).

39. Ivanou Ya. Ya., Maksimava V. A. English Equivalents of Belarusian Proverbs (Lexicographical Aspect). *Vostochnoslavyanskiye yazyki i literatury v evropeyskom kontekste – 2015* [East Slavic Languages and Literature in the European Context – 2015]. Mogilev, MGU imeni A. A. Kuleshova Publ., 2016, pp. 191–196 (In Belarusian).

40. Petrushevskaya Yu. A. Belarusian Equivalents of English Proverbs (Lexicographical Aspect). *Die Phraseologie in Raum und Zeit*. Greifswald, E. M. A.-Universität & Saint-Petersburg, SPbSU Publ., 2012, pp. 136–137 (In Russian).

41. Ivanov E., Feldman V. Principles of the Contrastive Description of Aphoristic Paremiology (in Belarussian and Russian Languages). *Acta Germano-Slavica*, 2007, vol. 1, pp. 85–97.

42. Lepeshau I. Ya., Yakaltsevich M. A. *Tlumachal'ny slounik prykazak* [The Explanatory Dictionary of Proverbs]. Grodno, GrDU imya Yanki Kupaly Publ., 2011. 695 p. (In Belarusian).

43. *Shkol'nyy slovar' zhivykh russkikh poslovits* [School Dictionary of Active Russian Proverbs] / ed. by V. M. Mokienko. Saint-Petersburg, Neva Publ., 2002. 352 p. (In Russian).

44. Co kraj to obyczaj [Electronic Resource]. *Polska tradycja*. 2019. Available at: https://www.polskatradycja.pl/folklor/przyslowia/co-kraj-to-obyczaj-co-rodzina-to-zwyczaj.html (accessed 20.12.2021). (In Polish).

45. Ridout R., Witting C. *English Proverbs Explained*. London, Pan Books LTD Publ., 1969. 223 p.

46. Shkraba I., Shkraba R. *Krynichnaye slova: belaruskiya prykazki i prymauki* [Source Word: Belarusian Proverbs and Sayings]. Minsk, Mastatskaya litaratura Publ., 1987. 286 p. (In Belarusian).

47. Zhukov V. P. *Slovar' russkikh poslovits i pogovorok* [Dictionary of Russian Proverbs and Sayings]. Moscow, Russkiy yazyk Publ., 1991. 534 p. (In Russian).

48. Holm P. *Ordspråk och talesätt*. Stockholm, Albert Bonniers förlag, 1965. 385 s. (In Swedish).

## Інфармацыя пра аўтараў

**Алёшын Аляксей Сяргеевіч** – кандыдат філалагічных навук, дацэнт, загадчык кафедры замежных моў гуманітарнага факультэта. Санкт-Пецярбургскі дзяржаўны ўніверсітэт тэлекамунікацый імя М. А. Бонч-Бруевіча (191186, г. Санкт-Пецярбург, набярэжная ракі Мойкі, д. 61, Расійская Федэрацыя). E-mail: alexis001@mail.ru

**Іваноў Яўген Яўгенавіч** – доктар філалагічных навук, дацэнт, загадчык кафедры тэарэтычнай і прыкладной лінгвістыкі. Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. А. Куляшова (212022, г. Магілёў, вул. Касманаўтаў, 1, Рэспубліка Беларусь). E-mail: ivanov-msu@mail.ru

## Information about the authors

**Aleshin Aleksey Sergeyevich** – PhD (Philology), Associate Professor, Head of the Department of Foreign Languages, Faculty of Humanities. The Bonch-Bruevich Saint-Petersburg State University of Telecommunications (61, Moika river embankment, 191186, St. Petersburg, Russian Federation). E-mail: alexis001@mail.ru

**Ivanov Evgeniy Evgen'yevich** – DSc (Philology), Associate Professor, Head of the Department of Theoretical and Applied Linguistics. Mogilev State A. Kuleshov University (1, Kosmonavtov str., 212022, Mogilev, Republic of Belarus). E-mail: ivanov-msu@mail.ru

*Паступіў 15.01.2022*